**13 кастрычніка– 65** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА АЛЯКСАНДРАВІЧА МІХАЙЛАВА** (1950, в. Ушкавіца, Кобрынскі раён), беларускага мовазнаўца, педагога, спецыяліста ў галіне дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, анамастыкі, этналінгвістыкі, навуковай тэрміналогіі.



Імя **Паўла Аляксандравіча Міхайлава**, дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, сумленнага даследчыка і адоранага педагога, добра вядомае навукоўцам і выкладчыкам у Беларусі і далёка за яе межамі. Грунтоўныя веды, акадэмічны вопыт, вернасць аднойчы абранаму шляху дазваляюць заслужана лічыць П. Міхайлава адным з вядучых дыялектолагаў Беларусі. П.А. Міхайлаў - беларускі мовазнавец, педагог, спецыяліст у галіне дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, анамастыкі, этналінгвістыкі, навуковай тэрміналогіі.

Павел Міхайлаў нарадзіўся 13 кастрычніка 1950 г. 1973) у в. Ушкавіца Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1968 г. закончыў сярэднюю школу № 1 г. Кобрына, у 1971 г. пасля службы ва ўзброеных сілах паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Надзелены матэматычным складам мыслення, П. Міхайлаў аддаў перавагу мовазнаўству менавіта таму, што з усіх гуманітарных навук

якраз лінгвістыка валодае найбольш дакладнымі метадамі даследавання.

Першымі завершанымі навуковымі даследаваннямі П. Міхайлава сталі працы “Батанічная тэрміналогія палескай гаворкі в. Сінкевічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобласці” і «Жанравая прырода “Слова аб палку Ігаравым”», якія былі адзначаны дыпломамі на рэспубліканскім конкурсе навуковых работ.

У студэнцкія гады з’явіліся і першыя публікацыі П. Міхайлава, якія сталі сведчаннем таго, што ў навуку прыйшоў даследчык са сваёй пазіцыяй, з тонкім адчуваннем слова і добрым веданнем прадмета даследавання.

Педагагічны інстытут П. Міхайлаў закончыў з адзнакай у 1975 г.

Пасля некалькіх месяцаў працы настаўнікам рускай і беларускай моў і літаратур Лелікаўскай сярэдняй школы Кобрынскага раёна (1975) П. Міхайлаў падаў дакументы для паступлення ў аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. У лістападзе 1975 г. П. Міхайлаў быў залічаны ў аспірантуру Інстытута мовазнаўства па спецыяльнасці “Беларуская мова”.

Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам сектара дыялекталогіі (1976-1982), вучоным сакратаром (1982-1986), загадчыкам аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР (1986-1991); дацэнтам кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М.Горкага (1991-1993). З 1993 г. па 2009 гг. - загадчык кафедры беларускага

мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта (БДПУ) імя Максіма Танка.

П.А. Міхайлаў абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Лексіка беларускіх ганчароў» (1981). Павел Аляксандравіч Міхайлаў - кандыдат філалагічных навук (1981), дацэнт (1994).

П.А. Міхайлаў - аўтар больш за 140 навуковых і навукова-метадычных прац па разнастайных актуальных пытаннях сучаснай беларускай лінгвістычнай і метадычнай навукі. Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДПУ імя Максіма Танка, член вучоных саветаў універсітэта і факультэта беларускай філалогіі і культуры.

Прымаў удзел у падрыхтоўцы міжнародных навуковых праектаў: стварэнні «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа» і «Лінгвістычнага атласа Еўропы», "Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці лексічнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы", "Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння". Аўтар шэрагу базавых і тыпавых праграм для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь, сааўтар прац:«Тураўскі слоўнік», «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе паграніччa» , «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак», «Мікратапанімія Беларусі», «Лексічныя ландшафты Беларусі», «Кароткі руска-беларускі тлумачальны слоўнік па агульнай біялогіі», «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас: Серыя лексіка-словаўтваральная», «Беларуская мова: Дыктанты, пераказы, пераклады: 5 клас; 6 клас; 7 клас; 8 клас; 9 клас» і інш.

У сферы навуковых інтарэсаў вучонага - беларуская дыялекталогія, лінгвагеаграфія, анамастыка, тэрміназнаўства і гісторыя лінгвістыкі. Некалькі дзясяткаў навуковых публікацый прысвяціў П. Міхайлаў пытанням беларускай акцэнталогіі.

Аўтар прац: “З мікратапаніміі Кобрыншчыны” (1985), “Беларуская дыялектная лексікаграфія: гісторыя, сучасны стан і перспектывы” (1995) і інш. Сааўтар прац: “Тураўскі слоўнік” (1982 --1987), “Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча” (1979 -- 1986), “Лексічны атлас беларускіх народных гаворак” (1993 -- 1998), “Лексічныя ландшафты Беларусі: жывёльны свет” (1995), “Агульнаславянскі лінгвістычны атлас” (2000), “Сучасная беларуская літаратурная мова: тэсты для тэматычнага кантролю” (2006) і інш.

Навуковы кансультант часопіса “Роднае слова”, член рэдкалегіі навуковых зборнікаў “Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння” (2009, 2011, 2013).

Падрыхтаваў 8 кандыдатаў навук. Узнагароджаны нагрудным знакам “Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь” і граматамі.

***Матэрыял падрыхтаваны ў 2015 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі***

***Працы П.А. Міхайлава***

**Міхайлаў, П. А.** Беларуская мова : тэматычны трэнажор : фанетыка. Арфаэпія. Арфаграфія : для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / П. А. Міхайлаў, А. К. Пекач, С. І. Фацеева. – Мінск, 2009.

**Міхайлаў, П.А.** Беларуская мова : тэматычны трэнажор : лексікалогія, фразеалогія, асновы стылістыкі : для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / П. А. Міхайлаў, С. І. Фацеева. – Мінск, 2008.

**Міхайлаў, П.А.** Беларуская мова : 7-ы кл. : Дыктанты, пераказы, пераклады : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў / П.А.Міхайлаў, С.І.Фацеева. – Мінск, 2002.

**Міхайлаў, П. А.** Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сэрэдняй адукацыі : тэксты дыктантаў / Міхайлаў Павел Аляксандравіч; [складальнікі: Л. М. Гамеза і інш].- Мінск, 2013.

**Міхайлаў, П.А.** Сучасная беларуская літаратурная мова: тэсты для тэматычнага кантролю / П. А. Міхайлаў.- Мінск, 2006.

**Міхайлаў, П.А.** Тэсты для тэматычнага кантролю па беларускай мове : 7-ы кл. : дапам. для настаўнікаў установ, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання з 12-гад. тэрмінам навучання / П.А. Міхайлаў, М.І. Навумчык, С.І. Фацеева. – Мінск, 2005.

**Міхайлаў, П.А.** Тэсты для тэматычнага кантролю па беларускай мове : 5-6-я кл. : Дапам. для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання з 12-гад. тэрмінам навучання / П.А.Міхайлаў, М.І.Навумчык, С.І.Фацеева. – Минск, 2004.

***Аб жыцці і працы***

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч //** Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С. 438: фота. – (Імі ганарацца землякі).

**Нацыянальная** мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння : навуковы зборнік да 60-годдзя Паўла Аляксандравіча Міхайлава / [рэдкалегія: Д. В. Дзятко (адказны рэдактар і інш.)]. – Мінск, 2010.

**Дзятко, Д.** Пра майго настаўніка / Дзмітрый Дзятко // Роднае слова. - 2015.— № 10. — С. 48-49. - Да 65-годдзя Паўла Міхайлава, ураджэнца Кобрынскага раёна, беларускага мовазнаўца, педагога, спецыяліста ў галіне дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі.

**Дзятко, Д.** Адданы беларускай навуцы / Дзмітрый Дзятко // Роднае слова. – 2010. - № 10. – С. 33-35.- Да 60-годдзя П.А. Міхайлава, ураджэнца в. Ушкавіца Кобрынскага раёна, беларускага мовазнаўца, педагога, спецыяліста ў галіне дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, анамастыкі, этналінгвістыкі, навуковай тэрміналогіі.

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** (нар. 13.10.1950, в. Ушкавіца), беларускі мовазнавец, педагог, кандыдат навук, загадчык кафедры мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага

педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка // Роднае слова. – 2000. - № 10. – С. 26.

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Беларуская лінгвістыка. Кафедра беларускага мовазнаўства БДПУ. - Режим доступа: http://belmova-bspu.ucoz.ru – Дата доступа: 21.09.2015.

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка. Факультет белорусской и русской филологии. – Режим доступа:http://fbrf.bspu.by/kafedry/kafedra-belorusskogo-yazykoznaniya/vykladchyki. – Дата доступа: 18.09. 2015.